Пралетарыі ўсіх краёў, злучайцеся!

Савецкая Беларусь

Орган Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Саветаў БССР.

АДРЭС РЭДАКЦЫІ: МЕНСК, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса (2-гі Дом Саветаў).

ТЭЛЕФОНЫ: Рэдакцыі—№ 478. Рэдактара—№ 769.

Матар'ял прымаецца—з 9-й да 3½ гадз.

Навыкарыстаныя рукапісы назад аўтарам не вяртаюцца.

КАНТОРА: Менск, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса. Тэлефон № 244. (2-гі Дом Саветаў).

ПАДПІСНАЯ ПЛАТА: На 1 месяц — 90 к. На 3 — 2 р. 70 к. На 6 — 4 р. — к. На 1 год — 8 р. — к. Зьмена адрэсу: іншагародзям — 30 к. пасёлкам — 10 к.

ПЛАТА ЗА АББЕСТКІ: За радок шапкавай пасьля тэксту — р. 50 к. За радок шапкавай наперад тэксту 1 р. — к. За радок шапкавай перад тэкстам 1 р. 50 к. Абвешчаньні на 50 проц. дарожэй. Зьмена тэрміну бярэцца 10 проц. плаціць.

ПЛАТА ЗА ПУБЛІКАЦЫІ: За 1 дакумэнт — 35 к. За кожны дадатковы — 15 к. Беспраплатныя і чырвонаармейцы за дакумэнт — 15 к. За кожны дадатковы — 5 к. Публікацыя ЗАГО'у—3 руб.

ПАДПІСКА ПРЫМАЕЦЦА ў канторы газэты, на ўсіх аддзяленьнях Беларускага Дзяржаўнага Выдавецтва і на ўсіх пошт.-тэл. канторах. АББЕСТКІ ПРЫМАЮЦЦА канторай газэты: Менск, рог Ленінскай і Карла Маркса (2-гі дом Саветаў).

10 год выданьня. — ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА. — № 173 (2652) Чацьвер, 1-га жніўня 1929 г.

СЁНЬНЯ МІЖНАРОДНЫ ЧЫРВОНЫ ДЗЕНЬ.

...ае жніўня--дзень мабілізацыі рэвалюцыйных сіл сусьветнага пралетарыяту супроць новай імпэрыялістычнай вайны, супроць буржуазеі і яе прыслужнікаў--сацыял-дэмакратаў.

Індустрыялізацыя нашай краіны, калектывізацыя савецкай вёскі—шлях умацаваньня абароназдольнасьці СССР.

УСЕ НА БАРАЦЬБУ СУПРОЦЬ ІМПЭРЫЯЛІСТЫЧНАЙ ВАЙНЫ, УСЕ НА АБАРОНУ СССР!

...м рабочых, чырвонаармейцаў і працоўнага насельніцтва БССР.

Таварышы!

...а пасьпела яшчэ чалавецтва ...ыць тыя раны, што нанесла імпэрыялістычная вайна, як ...рыялісты ўсяго сьвету зараз ...пачалі рыхтавацца да новай ...нячуванай бойні. Шалёным ...ам растуць узбраеньні ва капіталістычных краінах, ма...юцца ўсе сілы, каб зноў, як ...год таму назад, крывавая ...ь вайны ахінула сьвет, пры...ы зьнішчэньне мільёнам пра...ых, зьнішчэньне створаных ...м і крывёй працоўных ка...насьцяў.

...раз вайна ў першую чаргу ...уецца супроць адзінай у сьве...раіны пралетарскай дыктату... СССР.

...йныя посьпехі сацыялістыч... будаўніцтва, індустрыялізацыі краіны, пры вялікім творчым ...ізьме працоўных, не даюць ...ветнаму імпэрыялізму зрабіць ...аіны Саветаў рынку для сваіх ...раў і капіталаў. Наадварот, ...а посьпехі яшчэ болей узмац...ь СССР, базу сусьветнай рэ...цыі, як бацькаўшчыну пра...х усяго сьвету. Дзеля гэта... сьветнае капіталізм, робячы ...кацыйныя выпады, як напад ...Кітайска-Ўсходняй чыгункі ..., мабілізуюць усе сілы, вя...шалёную падрыхтоўку да ...у на СССР. Ніякія размовы ...лістаў аб разброеньні ня ...даюць гэтай небясьпекі но...йны.

...на і вайна ў першую чаргу ...ць Савецкага Саюзу ставіц... парадак дню.

...народны сацыял-фашызм са ...адданасьцю, са ўсёй шчы...ю дапамагае сусьветнай ...азіі ў гэтай справе. Рукамі ...ял-фашысцкага ўраду Мюль... ў Нямеччыне, „рабочага" ... Макданальда ў Англіі і ўсяго сусьветнага сацыял-фашызму імпэрыялізм агідную спра...дрыхтоўкі нападу на СССР. ...ам з гэтым на грунце няў...івай гнілой стабілізацыі рась...валя новых рэвалюцыйных ... Узмацняецца фронт сусьвет...пралетарскай рэвалюцыі, мац...ь сілы пралетарыяту, шчыль...б'яднаюцца працоўныя нава...камуністычнай партыі і шта...сусьветнай рэвэлюцыі—Камун...чнага Інтэрнацыяналу. Пер...йская дэманстрацыя ў Бэр...статчкі ў Лодзі, барацьба ...ыльшчыкаў у Бамбеі пацьвяр...оць гэта. Пралетарыят усяго ...гу выступае ў контр-атаку ...оць імпэрыялізму.

...Міжнародны Чырвоны Дзень ...ны пралетарыяў пад штан...дарамі камуністычных партый выйдуць на вуліцы дэманстраваць сваю моц, сваю волю да абароны адзінай бацькаўшчыны працоўных—СССР. Мільёны пралетарыяў будуць рабіць агляд баявых пралетарскіх сіл для рашучага наступленьня на капіталізм.

Таварышы! Будуючы сацыялізм, дэманструючы адзіна шчырае жаданьне да міру, працоўныя Савецкага Саюзу ні на хвіліну не павінны забываць небясьпекі новага нападу на СССР, яшчэ больш узмацняць абарону яго.

Шчыльней шэрагі навокал камуністычнай партыі. Больш увагі да ўзброенай сілы пралетарыяту—Чырвонай арміі!

Таварышы! Дэманструючы сёньня сваю волю да змаганьня з новай навалай імпэрыялістычнай вайны, яшчэ больш упарта, яшчэ больш старанна будзем будаваць нашу сацыялістычную гаспадарку, замацоўваць і пашыраць мэтад нашае працы — сацыялістычнае спаборніцтва, адказваючы на наглы наступ імпэрыялістаў падпіскай на 3-ю пазыку індустрыялізацыі. Рашуча павядзем наступленьне на прыватна-капіталістычны элемэнт. Узмацнім інтэрнацыянальную сувязь з працоўнымі ўсяго сьвету.

Таварышы! Дэманструючы супроць новай імпэрыялістычнай бойні, не забудзем мільёнаў барацьбітоў за справу пралетарскай рэвалюцыі. Не забудзем нашых братоў рабочых і сялян Заходняй Беларусі і Польшчы, што гібеюць у турмах польскага фашызму. Пашлём ім брацкае прывітаньне.

Таварышы! Усе на дэманстрацыю супроць новай імпэрыялістычнай вайны, супроць нападу на Савецкі Саюз!

НАХАЙ ЖЫВЕ СУСЬВЕТНАЯ РЭВАЛЮЦЫЯ!

ПРЭЧ ІМПЭРЫЯЛІСТАЎ І ІХ ПАСЛУГАЧОЎ—САЦЫЯЛ-ФАШЫСТАЎ!

НАХАЙ ЖЫВЕ СУСЬВЕТНЫ ПРАЛЕТАРЫЯТ!

ПРЭЧ ВАЙНУ ІМПЭРЫЯЛІСТЫЧНУЮ—НАХАЙ ЖЫВЕ ГРАМАДЗЯНСКАЯ ВАЙНА!

НАХАЙ ЖЫВУЦЬ БРАТЫ НАШЫ—РАБОЧЫЯ І СЯЛЯНЕ ЗАХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ І ПОЛЬШЧЫ!

НАХАЙ ЖЫВУЦЬ КАМУНІСТЫЧНЫЯ ПАРТЫІ ЎСЯГО СЬВЕТУ!

НАХАЙ ЖЫВЕ КАМУНІСТЫЧНЫ ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ — ШТАБ СУСЬВЕТНАЙ РЭВАЛЮЦЫІ!

ЦЭНТРАЛЬНЫ КАМІТЭТ КАМУНІСТЫЧНАЙ ПАРТЫІ (бальш.) БЕЛАРУСІ.

Усясьветны Чырвоны Дзень.

...ятнаццатая гадавіна сусьветнай ...ы выпала на пэрыяд, калі пы...не аб няўхільнасьці новай сусьвет...вайны паўстала цэнтральнай пра...ай бягучага моманту.

...пярэчнасьці паміж вялікімі дзяр...мі, асабліва паміж Паўночна-Амэ...анскімі Злучанымі Штатамі і Ан...й надзвычайна абвастрыліся. Але, ...ледзячы на гэты антаганізм ня ...ячы на сусьветную барацьбу за ...ні, за рынкі, ёсьць адна вайско...змова, у якой аб'яднаюцца ўсе ...рыялістычныя дзяржавы, — гэта ...а супроць СССР, супроць пралета...й дзяржавы, якая будуе сацыялізм. ...пэрыялісты дапамагаюць павяліч...ню і магутнасьці ўзброеных сіл у ...дніх з СССР дзяржавах. Ангельскі ...рыялізм інтрыгуе ў Афганістане, ...ператварыць яго ў антысавецкую ... Ён узмацняе свае індыйскія ар... На Балканах ідзе працэс утварэньня базы для вайсковых апэрацый супроць СССР. У Кітаі ўрад забойцаў ...йскіх рабочых і сялян аднавіў свае ...вакацыі.

...гэтай падрыхтоўцы вайны сацыял-...краты, якія паказалі сябе ў мину...вайну здраднікамі і забойцамі ...цоўных, адыгрываюць усё ўзрастаючую ролю. Уся розьніца паміж іх ...одзінамі ў мінулую вайну і ...аснымі паводзінамі ў тым, што ... 1914 годзе яны паказалі ...ам свой сапраўдны твар аген... імпэрыялізму толькі пасьля таго, ...вайна была абвешчана, зараз-жа ...адкрыта дапамагаюць імпэрыялі...м падрыхтоўваць новую сусьветную ...ню.

...оля ангельскай рабочай партыі, ...н дапамагла кансэрватыўнаму ўра...нанесьці паражэньне пралетарыяту ...ас уссагульнай забастоўкі, прыду...шэньне венскага паўстаньня і г. д.— усё гэта паступовыя зьвеньні палітыкі сацыял-дэмакратыі.

Францускія сацыялісты ўтвараюць міністэрства паўстранага флёту. Макдональд, які зноў стаў прэм'ерам ураду „яго вялікасьці", стараецца зачмуціць масы, упэўніць іх у сваіх мірных намерах. У Злучаных Штатах лідэр сацыялістычнай партыі Хільквіт, усхваляе дырэктара Джэнэрэл Электрык, арганізатара штрэйкбрэхэраў. Ва ўсім сьвеце сацыял-дэмакраты адыгрываюць вялікую ролю, як агэнты буржуазеі ў справе падрыхтоўкі вайны.

Сучасныя грозныя абставіны сьведчаць, што VI кангрэс Камінтэрну толькі выконваў свой абавязак перад рабочай клясай, абавязак кіраўніка рэвалюцыйнага руху, калі ён у сваёй рэзалюцыі пісаў:

„Кангрэс зазначае цэнтральным камітэтам усіх камуністычных партый, што яны безадкладна павінны распачаць палітычную, арганізацыйную і агітацыйна-прапагандысцкую працу па падрыхтоўцы да міжнароднага дню барацьбы супроць імпэрыялістычнай вайны і за абарону СССР. У гэты дзень працоўныя павінны дэманстраваць супроць наступленьня буржуазеі пад лёзунгамі; „Вайна імпэрыялістычнай вайне", „Адзіны рабочы фронт супроць наступу капіталістаў", «Абаронім Савецкі Саюз», „Падтрымаем рэвалюцыйную барацьбу калёніяльных народаў", «Выкрыем хлусьню сацыял-патрыётаў», «Арганізуем пралетарскую абарону».

1-ае жніўня—15-ая гадавіна абвяшчэньня вайны было вызначана, як Міжнародны Чырвоны Дзень, і ва ўсім сьвеце ў гэты дзень адбудуцца вялізарныя дэманстрацыі і забастоўкі пратэсту супроць ваеннай небясьпекі.

Г. Уікс.

НАША ЧЫРВОНАЕ СЬВЯТА.

Успомнім мінулае. Успомнім тыя праклятыя дні, калі стрэл, якім быў забіты кронпрынц аўстрыйскай дзяржавы Франц-Фэрдынанд у Сараеве, паслужыў сыгналам да пачатку чатырохгадовага масавага забойства людзей.

Справа была ня толькі ў забойстве сэрбскім гімназістам Прынцыпам вайсковага аўстрыйскага саноўніка і яго жонкі.

Не з-за гэтага выбухнула крывавая імпэрыялістычная вайна, якая каштавала сьвету дзесяць мілёнаў маладых чалавечых ахвяр, каля 25 мілёнаў параненых і пакалечаных, якая каштавала ўсім дзяржавам 59 мілярдаў залатых даваенных рублёў.

За што-ж, у імя чаго загінулі гэтыя мілёны рабочых і сялян, у імя чаго ў працягу чатырох гадоў крывавай бойні руйнаваліся, зьнішчаліся гарады і вёскі?

У імя цывілізацыі. У імя гуманнасьці. За лепшую будучыню чалавецтва, —будуць фальшыва пісаць у гэтыя дні пятнаццацігодзьдзя з дню сусьветнай бойні буржуазныя газэты ўсяго сьвету.

Але абманыць сусьветны пралетарыят зараз ужо цяжка. Мы ведаем добра, хто вінават у гэтай чатырохгадовай крывавай бойні.

Мы ведаем добра, што вінавайцы крывавай імпэрыялістычнай вайны 1914-18 г. г.—капіталісты: расейскія, ангельскія, францускія, нямецкія, паўночна-амэрыканскія.

Барацьба за сусьветныя рынкі, за сусьветную гегемонію, за новыя землі і новыя калёніі,—вось сапраўдная прычына імпэрыялістычнай вайны, вось за што мілёны працоўных склалі свае галовы на палёх крывавых боек.

* * *

З датай пачатку крывавай імпэрыялістычнай вайны зьвязана і вялізарнае здрадніцтва сацыял-дэмакратыі II Інтэрнацыяналу.

5-га жніўня сацыял-дэмакратычная фракцыя нямецкага рэйхстагу галасавала за ваенныя крэдыты.

І з гэтага дню II Інтэрнацыянал, як рэвалюцыйная рабочая арганізацыя, спыніў сваё існаваньне.

Ня лепш нямецкіх трымалі сябе ў часе вайны і іншыя дзеячы II Інтэрнацыяналу. Яны ўступалі ў буржуазныя міністэрствы, яны заклікалі працоўных да абароны „сваёй" буржуазеі, «сваёй» бацькаўшчыны. Яны прадавалі і абманвалі пралетарыят.

І толькі маленькая купка людзей—сапраўдных рэвалюцыянэраў сярод усеагульнага здрадніцтва і жахаў не здалі сваіх баявых пазіцый.

Гэта камуністычныя правадыры—старая, загартаваная ў баёх бальшавіцкая гвардыя, якая і зараз стаіць на чале рэвалюцыйнага руху і вядзе сусьветны пралетарыят на барыкады клясавай бойкі, да сусьветнай пралетарскай рэвалюцыі.

30 ліпеня, за тыдзень да пачатку сусьветнай бойні, францускія рэакцыянэры забілі ў Парыжы францускага сацыяліста Жана Жорэса. Яны забілі яго дзеля таго, што ён быў проці імпэрыялістычнай вайны.

Гэта была ня першая і не апошняя ахвяра сусьветнай рэакцыі. Потым загінулі ад рукі гэтых-жа наёмных забойцаў Карл Лібкнэхт, Роза Люксэмбург, Вароўскі і шмат іншых гэрояў-рэвалюцыянэраў...

* * *

У буры грамадзянскай вайны нарадзілася першая ў сьвеце рэспубліка працоўных—Саюз Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік.

Ужо хутка 12 год, як рабочая кляса СССР настойліва будуе сацыялізм, новую, нябачаную яшчэ нідзе форму чалавечых адносін.

Мы ня хочам вайны, мы жадаем міру, жадаем магчымасьці працягваць будаваць сацыялізм у нашай краіне.

Але ня так разважае, не аб тым марыць сусьветная буржуазея. Яе задачы—зьнішчыць Саюз Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік, яе мара—зьнішчэньнем рэспублікі працы загасіць той маяк, які сваім полымям паказвае пралетарыям усіх краін праўдзівы шлях да перамогі над капіталам.

Буржуазея рыхтуецца да новай сусьветнай бойні.

Чорныя хмары, якія спусьціліся на Далёкім Усходзе, грозна гавораць нам, што наш вораг ня сьпіць.

* * *

Сёньня, наша Чырвонае сьвята, сьвята таму, што пралетарыі ўсіх краін прадэманструюць сваю непарушную волю абараняць са зброяй у руках СССР.

Сёньня ўсюды—у Парыжы, у Лёндане, у Бэрліне, на поўначы і на поўдні, на ўсходзе і на захадзе, у далёкіх калёніях,—усюды, дзе ёсьць пакута, усюды, дзе б'ецца рэвалюцыйная думка — пралетарыят з чырвонымі штандарамі выйдзе на вуліцу, каб грозна крыкнуць сваім прыгнятацелям:

— Рукі прэч ад СССР! Рукі прэч ад нашай сапраўднай, адзінай пралетарскай рэспублікі!

І мы—працоўныя Савецкага Саюзу, выйдзем таксама сёньня на вуліцы нашых гарадоў і вёсак.

Мы выйдзем дзеля таго, каб перад усім сьветам прадэманстраваць наша імкненьне да мірнай працы, нашу цьвёрдую волю давесьці, ня гледзячы на ўсе перашкоды, будаўніцтва сацыялізму ў нашай краіне да пераможнага канца.

Н. Беліна-Падгаецкі.

ТОЛЬКІ ПЕРАМОГА ПРАЛЕТАРЫЯТУ ВА ЎСІМ СЬВЕЦЕ ПАКЛАДЗЕ КАНЕЦ ІМПЭРЫЯЛІСТЫЧНЫМ ВОЙНАМ. ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, РЫХТУЙЦЕСЯ ПЕРАТВАРЫЦЬ ВАЙНУ ІМПЭРЫЯЛІСТЫЧНУЮ Ў ВАЙНУ ГРАМАДЗЯНСКУЮ!

НАХАЙ ЖЫВЕ КАМІНТЭРН—ШТАБ СУСЬВЕТНАГА ПРАЛЕТАРЫЯТУ Ў БАРАЦЬБЕ СУПРОЦЬ ІМПЭРЫЯЛІСТЫЧНАЙ ВАЙНЫ.—НАХАЙ ЖЫВЕ САВЕЦКАЯ УЛАДА ВА ЎСІМ СЬВЕЦЕ!

РЫГОР ПАПАРАЦЬ.

ВАЙНА—ВАЙНЕ.

Таварышы мае,
па думках і ідэі,
Крыві працоўнае—
разьліты акіян...
Каб затушыць вялікія надзеі,
Чытаюць нам
і талмуд і каран.
Таварышы мае,
па думках і ідэі—
Ідэя моцная—
узросьціць флянс...
Шчэ на палёх крыжы
не парадзелі,
А сёньня новыя
рыхтуюцца
для нас.
Мы людзі новыя,
З душой сталёвай,
Расьпяць свой край не адда-
дзім—
Мы варту выставім
У моры бліскавіц
І ў бойку пойдзем як адзін.
Хай груганы зьлятаюцца
І кружацца ў паветры...
Надыдзе час!..
І нам паклоняцца
Віхуры, шквалы й ветры.
У дні гарматныя,
Жыцьцём расплатныя
Вышэй узьнімецца Чырвоны
Сьцяг
І на пажарышчы
Ўзмацнім палаючы
Вялікага Кастрычніку
працяг.
Таварышы мае,
па думках
і ідэі—
Ідэя моцная—
узросьціць флянс...
Шчэ на палёх крыжы
не парадзелі,
А сёньня новыя
рыхтуюцца
для нас.
Моцна абураны
вёска
і горад—
Плякаты на плоце,
плякат у вакне;
„Бойку рыхтуе сёньня нам
вораг"
Вайною-ж
адкажам
вайне.

31-VII-29 г.

КАНТРАСТЫ.

... Вэрсальская ўмова падлічыла прыблізныя страты ад імпэрыялістычнай вайны: 10 мільёнаў забітых, 15 мільёнаў памёршых ад ран, і на 20 мільёнаў менш нараджэньняў, чым у звычайны час. Вайна абышлася ў 600 міліярдаў залатых р., што складае больш паловы нацыянальнага багацьця ўсіх дзяржаў, якія прымалі ўдзел у вайне. Імпэрыялісты ўсіх краін хочуць паўтарыць 4-е жніўня 1914 году. Яны хочуць золата, ярыві. Але стыхія не падначальваецца чалавечым законам. Стыхія не прызнае крэйсэраў Амэрыкі і самалётаў Францыі. У стыхіі свае законы, свае шляхі. Стыхія—рэвалюцыя, стыхія—мільёны працоўных зямной кулі.

... „Ня так даўно,—піша з Вены І. Рот,—адна з газэт („Дэр Абэнд") надрукавала сьпіс тых месцаў у Вене, дзе фашысты пад кіраўніцтвам дзяржаўных армейскіх афіцэраў вучыліся страляць з кулямётаў. Гэта навучаньне адбывалася ў глыбокіх глухіх сутарэньнях для таго, каб ня чутна была страляніна. Пасьля зьмяшчэньня сьпісу, паліцыя, якая добра знаходзіць у рабочых нават маленькі рэвальвэр, ня «здолела» знайсьці кулямётаў фашыстаў. Сацыял-дэмакраты, кіраўнікі паліцыі, не захацелі сварыцца з фашыстамі і папярэдзілі фашыстаў аб налёце паліцыі"...

... Вакханалія ўзброеньняў капіталістычных дзяржаў дасягнула найвышэйшай меры. Калі ў СССР вайсковых выдаткаў на душу насельніцтва прыходзіцца толькі 2,5 даляра, то ў Ангельшчыне—11,5 даляра, у Францыі—8,7 дал., у Італіі—6,3 дал. І разам з гэтым „матросы параходу „Фальке" адмовіўся перавозіць транспарт для Чан-Кай-Шы ў Шанхай, пакінулі арганізована параход. Капітан параходу хацеў набраць новых матросаў у Данцыгу, але яны ўсюды заяўлялі, што падтрымліваюць пралетарскую салідарнасьць з СССР і ніколі ня будуць дапамагаць узбройвацца заклятаму ворагу Савецкага Саюзу». Капітан сядзеў у каюце, кідаў за вакно —у чорную ноч папяросу за папяросаю і шукаў выхаду. Выхад быў знойдзен: навербавалі польскіх матросаў..., якія прадаюць самі сябе, клясу сваю і рэвалюцыю рабочую.

Але якую вагу маюць трэскі штрэйкбрэхэраў на хвалях салідарнасьці рабочых?

... «Пленум Падгойскага с.-с. ад 28-га ліпеня г. г. абгаварыў пытаньне аб правядзеньні Міжнароднага Чырвонага Дню і індустрыялізацыі краіны. Для ўзмацненьня фонду індустрыялізацыі, ўзмацненьня саюзу рабочае клясы з працоўным сялянствам і каб паказаць сусьветнаму капіталізму, што працоўнае сялянства СССР цьвёрда стаіць на варце аховы Кастрычнікавых заваёў—бяцкаўшчыны пралетарыяту—СССР, пастанавіў: усім сябрам сельскага савету ўнесьці ў фонд індустрыялізацыі краіны ня менш аднаго пуда хлеба бясплатна, здачу якога зрабіць 15-га верасьня г. г., а таксама падрыхтаваць да гэтага часу ўсё сялянства сельскага савету, каб не засталося ні аднаго двара, які-б ня здаў пуд хлеба ў фонд індустрыялізацыі краіны".

... І яшчэ: «Мы, камсамольцы баўманскага вайсковага атраду ў часе збору ў Лефортаве на дэманстрацыі сваёй падрыхтаванасьці да барацьбы з пагрозай імпэрыялістычнай вайны просім „Камсамольскую Праўду" залічыць нас у батальён яе імя. Мы просім таксама РВС СССР кінуць наш батальён на фронт пры першых стрэлах на савейкай граніцы. Права на гэтае мы абяцаем заваяваць у першай бойцы».

Кантрасты штурхаюць адзін другі. Клясы разьмясьціліся на двух супроцьлеглых канцавосьсях. Сярэдняя фарбы зьмяняюць свой твар, адыходзяць да тых або іншых кантрастаў, да той або іншай клясы. Клясавыя абвастрэньні паглыбляюцца, клічуць да новых боек. Не да боек, што распачаліся ў 1914 годзе,—абвастрэньні клічуць да канчатковай клясавай вайны, да сацыяльнай рэвалюцыі.

... Пралетарыят падрыхтаваны. Вайне—вайна! Шалёнай вакханаліі ўзброеньняў—стыхія рэвалюцыі!

Цім. Зарэчны.

Вайны мы ня хочам, а ў бой—гатовы.

Падрыхтоўка да Міжнароднага Чырвонага Дню праведзена па менскіх саюзах і прадпрыёмствах здавальняюча. На фабрыках і заводах адбываліся агульныя сходы рабочых, на якіх ставіліся даклады аб міжнародным становішчы і аб значэньні Міжнароднага Чырвонага Дню.

Рабочыя добра разумеюць небясьпеку вайны, яны кажуць, што кожнае наша новае дасягненьне ў галіне сацыялістычнага будаўніцтва ёсьць кол у грудзі ўсясьветным імпэрыялістам.

Апошні наглы налёт на Ўсходня-Кітайскую чыгунку кітайскіх фашыстаў рабочыя расцэньваюць, як правакацыю ўсясьветнай буржуазеі ўцягнуць нас у вайну.

Рабочыя патрабавалі ад свайго ўраду даць рашучы адпор зарваўшымся кітайскім імпэрыялістам і заяўляюць, што па першаму заклику партыі і ўраду яны зьменяць варштат на вінтоўку і ўстануць на абарону заваёў Кастрычніка.

Рабочыя патрабавалі ад савецкага ўраду выпуску III пазыкі індустрыялізацыі і запэўнілі, што поўная рэалізацыя яе забясьпечана. У рабочых—словы не разыходзіліся са справай, і яшчэ да выданьня дэкрэту аб выпуску новай пазыкі на фабрыках і заводах шырока разгарнулася папяровая падпіска на пазыку. Падпіска на пазыку разгортваецца з кожным днём усё больш і больш.

— Мы вайны ня хочам,—заяўляюць рабочыя,—мы хочам працаваць у мірных умовах, мы хочам у мірных умовах будаваць сацыялізм у нашай краіне.

Але мы павінны ўзмацняць абароназдольнасьць краіны, павінны яшчэ больш шпаркім тэмпам разьвіваць індустрыялізацыю нашай бацькаўшчыны СССР, каб у патрэбную мінуту даць належны адпор.

Вось чаму сярод шырокіх мас рабочых і наогул працоўных, па іх уласнай ініцыятыве пачаўся збор сродкаў на пабудову новых самалётаў.

Сёньня рабочыя Менску, а таксама і ўсяго Савецкага Саюзу выйдуць на вуліцы, каб падкрэсьліць сваю гатоўнасьць сустрэць усе небясьпекі.

Напружаным тэмпам нашага будаўніцтва зробім непераможнай краіну саветаў у барацьбе з міравым капіталам.

Няхай жыве Міжнародны Чырвоны Дзень—дзень мабілізацыі рэвалюцыйных сіл міравога пралетарыяту для барацьбы з імпэрыялізмам, з ваеннай небясьпекай, для абароны СССР—бацькаўшчыны пралетарыяту!

НЯХАЙ ЖЫВЕ МІЖНАРОДНЫ ЧЫРВОНЫ ДЗЕНЬ!

Ня гледзячы на шалёныя рэпрэсіі, пралетарыят капіталістычных краін 1-га жніўня прадэманструе сваю гатоўнасьць даць адпор падпальшчыкам новай імпэрыялістычнай вайны.

Тысячы палоньнікаў фашызму.

ПОЛЬСКІ ПРАЛЕТАРЫЯТ У ПЕРШЫХ ШЭРАГАХ БАРАЦЬБІТОЎ СУПРОЦЬ ІМПЭРЫЯЛІСТЫЧНАЙ ВАЙНЫ.

ВАРШАВА, 30-7. У сувязі з надыходзячым днём 1 жніўня па ўсёй Польшчы пракацілася хваля новых аблаў і арыштаў.

Учора ў Варшаве была наладжана ў рабочых райёнах аблава, у часе якой арыштавана 80 рабочых. Арыштаваныя перададзены ў загад палітычнай паліцыі.

У Лодзі кожную ноч паліцыя наладжвае масавыя вобыскі, аблавы і учыняе арышты. Арыштавана больш за 150 чалавек, з якіх некалькі дзесяткаў арыштавана ў памяшканьні лодзінскай арганізацыі ППС—лявіцы.

У Вільні таксама была наладжана аблава і вобыскі, у выніку чаго арыштавана больш за 100 чалавек.

У райёне Навгрудку паліцыя арыштавала вучняў беларускай гімназіі, якіх абвінавачвае ва ўдзеле ў падрыхтоўцы першажнівеньскай дэманстрацыі.

У Львове была ўчынена аблава і масавыя вобыскі. Арыштавана 304 ч.

Аднак, увечары на рабочых акраінах былі ўзьняты чырвоныя сьцягі з лёзунгамі да 1 жніўня за абарону СССР.

Ня пусьціць паліцыі ў завадзкія памяшканьні.

ПАРЫЖ, 30-7. У Сэнт-Эт'ене, не зважаючы на забарону, вобыскі і арышты, адбыўся рабочы зьезд басэйну Луары з удзелам прадстаўнікоў рэвалюцыйнага саюзу былых удзельнікаў вайны, жаночага саюзу барацьбы проці вайны і унітарных прафсаюзаў. Ухваленая зьездам рэзалюцыя падкрэсьлівае значэньне басэйну Луары, як цэнтру францускай вайсковай прамысловасьці і заклікае рабочых басэйну спыніць працу і выйсьці на дэманстрацыю 1 жніўня.

Такія-ж рэзалюцыі ўхвалілі капальнікі ў Асс на зьезьдзе басэйну Гар і рабочы зьезд тэкстыльшчыкаў і мэталёўцаў паўночнага раёну ў Лілі. У Парыжы, не зважаючы на шматлікія арышты, выканком раённай фэдэрацыі унітарных прафсаюзаў праводзіць далей сваю працу і кіруе падрыхтоўкаю да дню 1 жніўня.

На некаторых заводах у Парыжы і ваколіцах рабочыя ўхвалілі не дапушчаць паліцыі ў заводзкія памяшканьні. Сэкцыя чужаземных рабочых унітарнай фэдэрацыі працы агаласіла адозву, у якой, пратэстуючы проці арыштаў рабочых арабаў на сходзе ў Вільнэў-Сэн-Жарж, заклікае рабочых дэманстраваць 1 жніўня.

Чырвоныя франтавікі рыхтуюцца.

БЭРЛІН, 30-7. У шмат якіх гарадох Рурскай вобласьці сябры саюзу Чырвоных Франтавікоў, апранутыя ў форму, раздавалі ля фабрычнай брамы лятучкі з пратэстам проці забароны саюзу Чырвоных Франтавікоў і з заклікам да рабочых удзельнічаць у дэманстрацыях 1-га жніўня.

Рэфармісты і паліцэйскія заключылі саюз

ПАРЫЖ, 30-7. Рэфармісцкія прафсаюзныя арганізацыі ўжываюць усе захады да зрыву Чырвонага дню, агалашаючы адозвы, у якіх заклікаюць рабочых ня браць удзелу ў дэманстрацыях 1 жніўня, а таксама „рашуча процідзейнічаць спыненьню працы ў дзень 1 жніўня".

Як павядамляе „Пці Журналь". даны лятучкі з пратэстам проці забароны Чырвоных Франтавікоў і пастановы рэфармісцкай канфэдэрацыі працы далучыліся „хрыстыянскія" і анарха-сындыкалісцкія прафсаюзы.

З свайго боку прэфэкт дэпартаманту Сэны загадаў адміністрацыі гарадзкіх прадпрыёмстваў накладаць дысцыплінарныя ўзысканьні на ўсіх служачых і рабочых, якія спыняць працу ў дзень 1 жніўня.

Арышт кітайскіх камунараў.

ПЕКІН. Згодна паведамленьня «Ворд Чайна Стандарт», паліцыя арыштавала тут 5 чалавек, западозраных у прыналежнасьці да кітайскай кампартыі, выкрыўшы камуністычную літаратуру і агнястрэльную зброю.

Мясцовая ўлада атрымала загад нанкінскага ўраду аб забароне мітынгаў і дэманстрацый і аб пільным наглядзе за камуністамі ў зьвязку з надыходзячым Міжнародным чырвоным днём 1 жніўня.

Арышты і вобыскі ня спыняюцца.

ПАРЫЖ, 30-7. У Парыжы і ў правінцыі ня спыняюцца вобыскі ў рабочых арганізацыях і ў рэдакцыях органаў рабочага друку, а таксама арышты рабочых, якія распаўсюджваюць лістоўкі і прадаюць камуністычныя газэты.

Забарона дэманстрацыі 1-га жніўня.

ГЭЛЬСІНГФОРС, 30-7. Урад забараніў мітынгі і дэманстрацыі ў дзень 1 жніўня.

„Папярэдзіць усімі сродкамі".

ВЕНА, 30-7. Па ўсёй Баўгарыі ня спыняюцца арышты з мэтаю недапушчэньня дэманстрацый у дзень 1-га жніўня.

На ўсёй Румыніі мабілізаваны паліцэйскія сілы „для папярэджаньня ўсімі сродкамі" дэманстрацыі 1 жніўня. У некаторых гарадох павялічаны вайсковыя гарнізоны.

Забарона сходаў.

БЭРЛІН, 30-7. У Мюнхене забароненыя 1-га жніўня ўсе дэманстрацыі і сходы, у тым ліку і ў зачыненых памяшканьнях.

Мабілізацыя жандараў.

ПАРЫЖ, 30-7. Агенцтва Гаваса паведамляе з Брусэлю: „Лібр Бэльжык" (орган католікаў) паведамляе, што ў часе авіяцыйных сьвяткаваньняў у Вэрв'е былі выкліканы ўсе жандары з гораду Вэрв'е і Спа і накіраваны на мяжу з тым, каб не прапусьціць 600 нямецкіх рабочых - камуністаў, якія спрабавалі перайсьці мяжу для наладжаньня дэманстрацыі на бэльгійскай тэрыторыі. Дэманстранты былі адагнаны назад за кардон.

Дэманстрацыя жанчын-работніц.

БЭРЛІН, 30-VII. У Эсэне адбылася канфэрэнцыя жанчын-работніц Рурскай вобласьці. Пасьля сканчэньня канфэрэнцыі адбылася жаночая дэманстрацыя проці імпэрыялістычнай вайны з удзелам „чырвонага жаночага саюзу».

Выйдуць на вуліцу.

БЭРЛІН, 30-7. У Нюрэнбэрзе нелегальна адбылася дэлегацкая канфэрэнцыя фабрычна-заводзкіх камітэтаў Нюрэнбэргу і Фурту. Сацыял-дэмакратычны паліцэй-прэзыдэнт Нюрэнбэргу забараніў „усякую падрыхтоўку да правядзеньня Чырвонага дню". На канфэрэнцыі прысутнічала 150 дэлегатаў, з якіх большасьць былі беспартыйныя. Сярод дэлегатаў было таксама шмат радавых сяброў сацыял-дэмакратычнай партыі.

Канфэрэнцыя ўхваліла адозву, якая заклікае рабочых да масавых дэманстрацый у дзень 1-га жніўня, а таксама да пратэсту проці агульнанямецкага збору нацыянал-сацыялістаў (фашыстаў) назначанага ў Нюрэнбэрзе на 4-га жніўня.

Братаньне рабочых з салдатамі.

ПАРЫЖ, 30-7. „Юманітэ" паведамляе, што ў нядзелю ў Аахене ў часе міжнароднай дэманстрацыі проці імпэрыялістычнай вайны на шмат якіх памяшканьнях у рабочых райёнах гораду, не зважаючы на паліцэйскія забароны, былі вывешаны чырвоныя сьцягі. Праходзячы каля казарм бэльгійскага акупацыйнага войска, дэманстранты браталіся з салдатамі Бэльгіі.

Прыдушыць парушэньне „волі працы".

ПАРЫЖ, 30-7. Агенцтва Гаваса паведамляе: „У зьвязку з днём 1-га жніўня ўрад афіцыйна забараніў усе працэсіі, мітынгі і зборы на вуліцах і плянох. Урад будзе энэргічна прыдушваць кожнае парушэньне волі працы, а таксама гвалты проці прадстаўнікоў улады, і выніце з Францыі ўсіх чужаземцаў, якія возьмуць удзел у маніфэстацыях".

Паліцэйскі нагляд над камуністамі.

ПАРЫЖ, 30-VII. Згодна паведамленьня з Брусэлю, урадавыя рэпрэсіі ў Бэльгіі ня спыняюцца. У Шарлуа ўчынены вобыскі ў памяшканьні мясцовай арганізацыі кампартыі і на кватэрах некаторых камуністаў. У Брусэлі паліцыя ўстанавіла неафіцыйны нагляд над большасьцю сяброў мясцовай арганізацыі кампартыі.

Дэманстрацыі пад лёзунгамі 1-жніўня.

СТАКГОЛЬМ, 29-VII. Ва Ўпсале адбыўся ўчора наладжаны швэдзкім камсамолам юнацкі дзень, праведзены пад лёзунгамі 1-га жніўня. Пасьля мітынгу адбылася дэманстрацыя, у часе якой паліцыя канфіскавала адзін плякат з надпісам, якая, на яе думку, падрывала дысцыпліну ў арміі.

Пад уціскам капіталу

Галадаюць 31 дзень

ВЕНА, 30-VII. Водлуг паведамленьня з Бухарэсту, разгляд у судзе другой інстанцыі справы засуджаных па так званым «працэсе камуністаў» у Кляўзэнбэрзе назначан на 8-га жніўня. Засуджаныя па гэтым працэсе галадаюць ужо 31-шы дзень, патрабуючы прыстасаваць да іх амністыю. Мясцовыя газэты ня ўпэўнены, што галадаючыя дажывуць да разгляду справы ў судзе другой інстанцыі.

Павялічваюць рабочы дзень.

ЛЁНДАН, 30-VII. У Калькуце (Індыя) прадпрыёмцы джутавай прамысловасьці абвясьцілі аб аднаўленьні 60-цігадзіннага рабочага тыдню. Гэта выклікала бурнае абурэньне сярод рабочых. На 10-ці прадпрыёмствах ужо абвешчана забастоўка.

Па 5 гадоў катаргі

ВЕНА, 27. Згодна паведамленьня з Белграду надзвычайны суд прыгаварыў 5 рабочых на тэрміны ад 2-х да 5 гадоў за распаўсюджаньне першамайскіх праклямацый камуністычнай партыі.

Галадоўка палітзьняволеных.

ПАРЫЖ, 29-7. Палітычныя зьняволеныя ў парыскім астрозе Сантэ, у жаночым астрозе Сэн-Лазар і ў дзіцячым астрозе Піт-Ракет колькасьцю ў 150 чал. абвясьцілі галадоўку.

„Юманітэ" зазначае, што выступленьне гэтае зьяўляецца палітычным актам, адобраным ЦК кампартыі і бюро унітарнай канфэдэрацыі працы, у знак пратэсту проці фашысцкіх гвалтаў ураду нацыянальнага прыгнечаньня.

АНГЛА-САВЕЦКІЯ АДНОСІНЫ

ТОЛЬКІ ПРАЗ ДВА МЕСЯЦЫ МОГУЦЬ ПАЧАЦЦА САВЕЦКІЯ ПЕРАМОВЫ.

ЛЁНДАН, 30-7. Лібэральная „Дэйлі Кронікль" у перадавіцы так абмяркоўвае гутарку між т. Даўгалеўскім і Гэндэрсонам: „Перамовы могуць патрабаваць некаторага часу, але кожны разумны чалавек павінен жадаць посьпеху іх. Мы ня можам дамагчыся ўсіх гандлёвых пераваг, якімі карыстаюцца ў СССР немцы, калі ў Маскве ня будзе ангельскага дыплёматычнага прадстаўніка. Грамадзкая думка не павінна з гэтае прычыны дазваляць, каб яе перакрычаў лямант проці чырвоных. Больш таго, грамадзкая думка павінна разглядаць такі лямант як антыпатрыятычную спробу напаскудзіць Англіі ў шкоду яе нацыянальным інтарэсам. Перад Гэндэрсонам і іншымі міністрамі стаіць нацыянальная задача. Трэба даць ім магчымасьць выканаць яе. Яны могуць пацярпець няўдачу, бо, апроч штучных перашкод, ёсьць таксама і сапраўдныя перашкоды. Але нельга дапушчаць, каб гэтыя перашкоды павялічваліся".

„Манчэстэр Гардыян" піша, что таго, што Гэндэрсон ... ещца спачатку ў Гаагу, а ... гуць распачацца якія-небудзь ... ныя перамовы аб адваяванні ... савецкіх абсоін".

„АНГЕЛЬЦЫ" НЕ АДМОВІЛІСЯ АД БАРАЦЬБЫ З КАМУНІЗМАМ.

ЛЁНДАН, 30-7. Нагадваючы т. Даўгалеўскага з Гэндэрсонам, ...нінг Стандарт" (вячэрняя ...) выдасцца трэстам Бівэрбрука, «Бальшавікі ніколі ня ... крываць капіталізм у Англіі ... сама і ангельцы ніколі не ... ад выкрываньня камунізму ... не дыплёматычных зносін ... справа здаровага розуму, ... кага сэнсу ў дыплёматычным ... гарантыямі па нытаньні ... гандзе".

Тав. Межлаук—аб дагаворы з Фордам

МАСКВА, 30-7. Намесьнік старшыні ВСНГ СССР т. Межлаук, які вярнуўся з Амэрыкі, паведаміў супрацоўніку ТАСС падрабязнасьці згоды з Фордам і некаторымі іншымі амэрыканскімі фірмамі.

Мэтаю майго падарожжа ў Амэрыку —сказаў т. Межлаук,—было прыцягненьне тэхнічнай дапамогі для пабудовы ў СССР аўтазаводу на 100 тысяч машын у год, рэканструкцыі заводу АМО і для заснаваньня вытворчасьцяў, якія абслугоўваюць аўтабудаўніцтва.

Як вядома, Форд па ўгавору перадае нам усе свае патэнты і магчымыя ў далейшым тэхнічныя ўдасканаленьні тыпу яго машын і г. д.

Такое-ж абавязацельства мы ўзялі і на сябе, бо Форд лічыць, што савецкая сыстэма спрыяе вынаходкам і высокі тэхнічны ўзровень нашага інжынэрства бясспрэчна прывядуць да таго, што ў вырабе фордаўскіх машын на нашых заводах нашымі тэхнікамі будуць зроблены некаторыя паленшаньні.

Ва ўгаворы няма ніякага абмежаваньня прывозу ў СССР машын іншых марак, апроч фордаўскіх, бо Форд упэўнен у перавазе ... пу аўтамабілю.

Форд распачаў ажыцяўленьне ... вору з намі з вялікаю ... вылучыў лепшых сваіх ... тэхнічнай дапамогі групе ... жынэраў, якія знаходзяцца ... цы і заняты распрацоўкаю ... ніжагародзкага заводу. Кіраўнік ... Форда Сарэнсон і Рокедэль ... джаюць у СССР для заснаваньня ... месцам пабудовы аўтазаводных майстэрняў, тэхнічнай ... цыі і г. д.

За час майго пабыту ... удалося таксама падпісаць ... тэхнічнай дапамозе пры ... Сталінградзкага трактарнага ... самай буйнай амэрыканскай ... «Альбэрт Кан», якая ... распрацоўку праэкту пляну ... Інжынэры фірмы распрацавалі ... заводу з рэкорднай, нават для ... кі, хуткасьцю.

Дзякуючы гэтаму мы маем ... масьць шпарка заказаць ... гэтага заводу амэрыканскай ... „Мак Клітык" і „Маршал", ... гэта фірма таксама выказала ... рэкорднай шпаркасьцю.

Застой на Усходня-Кітайскай чыгунцы.

Бясчынства кітайскай паліцыі.

УЛАДЫВАСТОК, 30-7. Тут атрыманы весткі, што кітайская ўлада ў Харбіне ўстанавіла кантроль над дзейнасьцю Дальбанку, назначыўшы для гэтага чыноўніка з паліцэйскага кіраўніцтва. На чыноўнікаў усклаўдзен абавязак папярэдняга кантролю ўсіх апэрацый банку, у тым ліку і касавых. Адначасна кітайская ўлада патрабавала ад праўленьня Дальбанку перадачы кантралёрам найбольш важных ключоў ад кас і складаў. Свае загады па банку чыноўнікі аддаюць пагражаючы арыштам служачым.

Згодна інструкцыі паліцэйскім кантралёрам дадзена права арыштоўваць кожнага, хто ўвойдзе ў банк, калі ён пакажацца падазроным. Поўная беззаконнасьць і бясчынствы ўлады пазбаўляюць Дальбанк магчымасьці працаваць.

Масавае дэзэртырства ў кітайскай арміі.

ЧЫТА, 28-7. У Манчжурыі сярод кітайскага войска настрой перапуду. Нашыраецца масавае дэзэртырства. У мінулую ноч уцякло са зброяй некалькі сот салдат, захапіўшы з сабою горную гармату і бамбамёт. Гандляры і белагвардзэйскія элемэнты эвакуюцца ў Харбін. Уся кітайская і белая паліцыя нагрузілася ў вагоны. Арышты прафпрацаўнікоў у Харбіне ня спыніліся, таксама, як і забойствы і выдзекі.

Пазіцыя Японіі.

ТОКІЁ. У гутарцы з прадстаўнікамі друку прэм'ер Хамагуцы заявіў, што лепшым спосабам упарадкаваньня савецка-кітайскага канфлікту былі-б непасрэдныя перамовы, і што „Японія ня думае ў сучасны момант рабіць якія-небудзь актыўныя крокі, ці выступаць у якасьці пасрэдніка".

Хлусьня буржуазнага друку аб савецка-кітайскіх перамовах.

БЭРЛІН, 30-VII. Паўнамоцнае прадстаўніцтва СССР у Нямеччыне разасслала адхіленьне газэтных паведамленьняў, якія зьмяшчаліся за апошні тыдзень ужо 3 разы з розных крыніц заснованых па сутнасьці на інфармацыі кітайскага ўраду аб перамовах, якія, нібыта, адбываюцца між паўнамоцным прадстаўніком СССР і кітайскім пасланьнікам.

Наконт надасланай з Вашынгтону дадатковай „папраўкі", якая завярае, што перамовы ў Бэрліне яшчэ не праводзіліся, але што паўнамоцнае прадстаўніцтва СССР у Бэрліне зрабіла, нібыта, крокі, каб падрыхтаваць глебу дзеля гэтага ў кітайскага пасланьніка,—савецкае паўнамоцнае прадстаўніцтва заявіла, што і ў гэтым апошнім паведамленьні, як і ў папярэдніх, няма ніводнага слова праўды.

Грамадзкія колы Кітаю—за ліквідацыю канфлікту з СССР.

УЛАДЫВАСТОК, 25-7. Водлуг атрыманых тут вестак, у Харбіне ходзяць упартыя чуткі, што сярод мукдэнскай улады ў апошні час перамагае плынь, якая дамагаецца вырашэньня канфлікту з СССР ... згоду адпаведна прапаноў савецкай ноты.

Паведамляюць таксама, нібыта Чжан-Суэ-Лян пачаў схіляцца да мірнага вырашэньня канфлікту. У Харбіне заяўляюць, што мукдэнская ўлада зрабіла крокі да таго, каб давесьці да ведама СССР аб гэтых сваіх намерах.

Дальбанк ліквідуе сваю працу.

МАСКВА. З прычыны немагчымасьці для Дальбанку праводзіць далей сваю дзейнасьць старшыня праўленьня Дзяржбанку т. Пятакоў тэлеграфаваў старшыні праўленьня Дальбанку аб неабходнасьці ліквідаваць працу.

Аднавіць ранейшы парадак на УК чыгунцы.

ТОКІЁ. Японскі друк выказваецца за неабходнасьць аднавіць ранейшы парадак на Усходня-Кітайскай чыгунцы, згодна савецка-кітайскага ўгавору.

Мангольскія працоўныя—за абарону СССР

УЛАН-БАТОР, 30-VII. Цэнтральны камітэт і цэнтральная кантрольная камісія народна-рэвалюцыйнай партыі Манголіі і ЦК рэвалюцыйнага саюзу мангольскай моладзі, а таксама цэнтральны савет мангольскіх прафсаюзаў ухвалілі на аб'яднаным пасяджэньні рэзалюцыю з выказам абурэньня працоўных Манголіі ўчынкамі кітайстай улады, якая зьневажае інтарэсы міліёнаў працоўных Кітаю і парушае па загаду імпэрыялістычных дзяржаў Японіі і Англіі падпісаныя з СССР угаворы і правакуе вайну.

Рэзалюцыя заклікае бядняцкія і пралетарскія масы ўсяго сьвету стаць на абарону СССР, рашучай барацьбе з небясьпекаю вайны, да аб'яднаньня ўсіх натуг з мэтаю абароны вольнага ладу і тэрыторыі Манголіі ад розных наскокаў.

Правакацыйны наскок на „Мэталёвец".

ГЭЛЬСІНГФОРС, 28 ліпеня а 11-й гадз. увечары ў Гэльсінгфорскім порце на стаячую на якары пры запаленым агні савецкую яхту „Мэталёвец" наскочыў фінскі параход „Астры", які зрабіў яхце значныя папсаваньні. Ёсьць падставы думаць, што такі ўчынак зроблен знарок.

* * *

ГЭЛЬСІНГФОРС, 29-7. Водлуг пэўных вестак, фінскі параход, які наскочыў ў нядзелю на савецкую яхту «Мэталёвец», дзейнічаў з загадзя абдуманаю правакацыйную мэтаю. Фінская паліцыя трымала сябе надзвычайна дрэнна ў часе аварыі і пасьля яе. Капітану пацярпеўшай яхты было забаронена сыйсьці на ўзьбярэжжа, каб заявіць пратэст. Толькі на другі дзень пасьля ўмешаньня паўнамоцнага прадстаўніцтва праз міністэрства ... спраў паліцыя пусьціла ... ўзьбярэжжа.

Неабходна адзначыць, што ... яхты „Мэталёвец» і „Рэвалю... самага пачатку спаткалі ... мыя да сябе адносіны з боку ... улады. Насупроць міжнарод... чаям і таму прыёму, які ... скім суднам у савецкіх парт... ды не атрымалі дазволу ... ўзьбярэжжа, а пазьней ім ... не зважаючы на пратэст ... га прадстаўніцтва, сходзіць ... 3 гадзіны. Гэтыя адносіны ... улады зьяўляюцца працягам ... прасьледаваньняў савецкіх ... фінскіх водах, што выклікаў ... ніку дыплёматычныя пратэсты ... кага ўраду.

Колькі Расеі каштавала вайна.

МАСКВА. 4 дэлегаты рабочых Балтыцкага заводу наведаліся да Народнага Камісара Фінансаў СССР т. Брухана і мелі з ім доўгую гутарку. У зьвязку з асаблівай зацікаўленасьцю, выказанаю дэлегатамі да пытаньня аб царскіх даўгох, т. Бруханаў падрабязна інфармаваў рабочых дэлегатаў аб даўгох, зробленых царскім урадам унутры краіны і заграніцаю.

Да 1914 году сума доўгу дзяржавы па пазыках складала 13 міліярдаў руб. За час вайны былі зроблены дадатковыя пазыкі на 31 міліярд. На душу насельніцтва перад ... прыпадала 98 руб. дзяржаўнага ... а за час вайны гэтая сума ... лася да 377 руб.

Тав. Бруханаў на запытаньне ... таў ленінградзкіх пралетарыяў ... це апошніх буйных войн ... што японская вайна каштавала ... скай Расеі 2 з паловаю міліярдаў ... лёў, а імпэрыялістычная вайна ... году—каля 60 міліярдаў руб...

ЦІ МАГЧЫМЫ НОВЫЯ РЭВАЛЮЦЫІ БЕЗ ВАЙНЫ?

Гэта пытаньне вельмі важнае, гэта адно з вузлавых пытаньняў усёй тактыкі ленінізму.

Ні Маркс, ні Ленін ніколі ня лічылі, што рэвалюцыя нараджаецца толькі з вайны. Яны толькі лічылі, што некаторыя войны пры вядомых абставінах зьяўляюцца „ускорителями" рэвалюцыйнага разьвіцьця. Рухаючыя сілы ўсякай рэвалюцыі гэта—клясавыя супярэчнасьці, клясавая барацьба. Вайна ёсьць працяг палітыкі толькі іншымі сродкамі. Войны пры пэўных абставінах могуць у пэўных краінах паскорыць рэвалюцыю. Але нараджаюць рэвалюцыю супярэчнасьці паміж клясамі, барацьба клясаў.

У такім адказным дакумапце, як ленінскія тэзісы «Сацыялістычная рэвалюцыя і права нацый на самавызначэньне", Ленін у 1916 г. пісаў так:

„Сацыялістычная рэвалюцыя можа разгарэцца ня толькі з-за буйнай стачкі, вулічнай дэманстрацыі, або галоднага бунту, ад вайсковага паўстаньня, або калёніяльнага мецяжу, але з-за кожнага палітычнага крызісу, накшталт справы Дрэйфуса, ці Царскага інцыдэнту, ці ў сувязі з рэферэндумам па пытаньні аб аддзяленьні прыгнечаных нацый і г. д." (Том XIX, стар. 170).

Вось праграмная заява Леніна, якая не пакідае месца ніякім крыватлумачэньням. На гэту заяву спасылаўся Ленін і ў часе III кангрэсу Камінтэрну ў камісіі, якая выпрацоўвала тактычную рэзалюцыю. Гэтай думкай далкам прасягнута тактычная рэзалюцыя III кангрэсу, у складаньні якой Ленін прымаў кіруючы ўдзел.

Сацыялістычная рэвалюцыя, казаў Ленін, можа распачацца ня толькі з вайсковага паўстаньня, або калёніяльнага мецяжу, але з буйнай стачкі, з палітычнага крызісу, як справа Дрэйфуса і г. д., і г. д.

Чым больш набліжалася пралетарская рэвалюцыя, тым больш напружана думаў Ленін аб тым, які менавіта будзе канкрэтны ход гэтай рэвалюцыі. Як у 1905 г. на III зьезьдзе кампартыі, напярэдадні першай буржуазна-дэмакратычнай рэвалюцыі ў Расеі Ленін напружана думаў аб тым, які менавіта будзе канкрэтны ход гэтай рэвалюцыі, якімі будуць канкрэтна формы руху (злучэньне агульнай стачкі з узброеным паўстаньнем і г. д.)—так, напярэдадні 1917 г. Ленін усё глыбей разважаў менавіта над пытаньнем аб тым, якімі будуць канкрэтныя формы разьвіцьця рэвалюцыі сацыялістычнай.

«Сацыяльная рэвалюцыя ня зможа ўтварыцца інакш, як у выглядзе эпохі, якая злучае грамадзянскую вайну пралетарыяту з буржуазеяй і цэлы шэраг дэмакратычных, рэвалюцыйных, у тым ліку і нацыянальна-вызваленчых рухаў у неразьвітых, адсталых і прыгнечаных нацыях" (том XIII, 369)—пісаў Ленін у сваім палемічным артыкуле „Імпэрыялістычны эканамізм", накіраваны супроць „левых" камуністаў таго часу (т. т. Пятакоў, Бухарын і інш.).

„Думаць, што магчыма сацыялістычная рэвалюцыя без паўстаньня дробных нацый у калёніях і ў Эўропе, без рэвалюцыйнага выбуху часьці дробнай буржуазеі з усімі яе забабонамі, бяз руху несьвядомых пралетарскіх і напаўпралетарскіх мас супроць абшарніцкага, царкоўнага, манархічнага нацыянальнага і г. д. прыгнечаньня, разважаць гэтак,—значыць, адмовіцца ад сацыялістычнай рэвалюцыі». (XIX, 219),—пісаў Ленін у палеміцы супроць прыхільнікаў Розы Люксэнбург.

Ні ў якім разе ў гэтых клясычных вызначэньнях Леніна нельга знайсьці тэй „думкі", быццам рэвалюцыі магчымы **толькі** ў сувязі з вайной.

Вайна ёсьць працяг палітыкі. Імпэрыялістычныя войны—ёсьць працяг імпэрыялістычнай палітыкі. Гэтыя войны зьяўляюцца важнейшым паказальнікам таго, што растуць клясавыя супярэчнасьці ў нацыянальным і ў інтэрнацыянальным маштабе, што абвастраецца барацьба па ўсім сьвеце, што цесна вытворчым сілам у нацыянальных рамках, што шпарка коціцца капіталізм да пагібелі.

Вайна пры пэўных абставінах робіцца вызіварным **„ускорителем"** рэвалюцыйнага руху.

Найбольш яскравым прыкладам гэтага можна было-б узяць ролю імпэрыялістычнай вайны ў рускай рэвалюцыі 1917 году.

Насьпяваньне рэвалюцыйнага крызісу ў Расеі з 1912 г. ішло з вялікай шпаркасьцю. У 1914 г. рэвалюцыйны ўздым у Расеі дасягнуў ужо вельмі вялікай інтэнсыўнасьці. Не задоўга да абвяшчэньня вайны справа даходзіць ужо ў Пецеры да барыкад. Вайна спачатку на некаторы час **затрымала** далейшы рэвалюцыйны ўздым, але затое пасьля ў надзвычайнай меры **паскорыла** рэвалюцыйнае разьвіцьцё ў Расеі. У 1917 годзе ў Расеі выбухнула **першая** з вялікіх рэвалюцый у часе вайны менавіта таму, што ўжо ў 1914 г. Расея была бліжэй за ўсіх да рэвалюцыі, іменна таму, што Расея была цяжарна рэвалюцыяй.

Пералічваючы „абавязковыя" канстытуцыйныя адзнакі рэвалюцый, Ленін ні ў якім разе не гаворыць, што ў ліку іншых адзнакаў „абавязковай" аднакай зьяўляецца вайна. Ленінская фармуліроўка „асноўнага закону рэвалюцыі", зразумела, **ні ў якім разе ня выключае** (а дапушчае), што пры вядомых абставінах можа паслужыць вызіварным **„ускорителем"** рэвалюцыі. Але нідзе ў Леніна вы ня знойдзеце і намёка на тое, што **толькі** з вайны можа распачацца рэвалюцыя.

Бальшавізм увайшоў у імпэрыялістычную вайну 1914 году з лёзунгам дэмакратычнай дыктатуры пралетарыяту і сялянства для **Расеі**. Бальшавізм да канца вайны агаласіў **сацыялістычную** рэвалюцыю і для **Расеі**. Роля імпэрыялістычнай вайны **ня толькі як „ускорителя"**, але як «углыбителя» рэвалюцыі тут відавочна.

Але сказаць „рэвалюцыя можа нарадзіцца толькі з вайны"—гэта значыць быць **пацыфістам навыварат**; гэта значыць у сучасных абставінах падаць палец апартунізму, а апартунізм возьме ўсю руку.

* * *

Бальшавікі гаворыць, што эпоха, у якую мы жывём, ёсьць эпоха войн і рэвалюцый. І правільна гаворыць. Возьмем мінулае дзесяцігодзьдзе з дню сканчэньня сусьветнай вайны. Гэтае дзесяцігодзьдзе лічаць, як дзесяцігодзьдзе „мірнага" разьвіцьця капіталізму. Яно сапраўды «мірнае» ў параўнаньні з 1914-1918 г. г., калі кроў лілася ракой, калі на палёх імпэрыялістычнай бойні гінулі міліёны, калі паліліся сёлы і гарады і спусташаліся цэлыя вобласьці. Але калі параўнаць гэта дзесяцігодзьдзе (1918-28 г.) з дзесяцігодзьдзем, скажам, даваенным (1904-1914 г.), дык стане ясна, які „мірны" характар дзесяцігодзьдзя, што прайшло з часу сканчэньня сусьветнай вайны. У працягу дзесяцігодзьдзя 1918-28 г. мы бачылі шэраг войн, у кожным разе шэраг буйных ваенных сутычак ня толькі ў Эўропе, але і ў Азіі, у Афрыцы, Амэрыцы. Невялічкі і **вельмі поўны** пералік вялікіх і малых сутычак, якія мелі месца за гэты час, упэўніць нас у гэтым.

Эўропа. Барацьба Нямеччыны з Польшчай з-за Верхняй Сілезіі. Узброеная акупацыя Руру і так званае пасыўнае супраціўленьне ў 1923 г. Захоп Польшчай Віленшчыны і шэраг узброеных пагранічных сутычак паміж Польшчай і Літвой. Захоп Італіяй правінцыі Фіумэ, італа-грэцкі канфлікт. Грэка-турэцкая вайна, г. зн. на справе англа-турэцкая вайна. Балканская ўзброеная барацьба з-за тэрыторый. Захоп Румыніяй шэрагу зямель, якія ўваходзілі ў былую Аўстра-Вэнгрыю.

Азія. Грамадзянская вайна ў Кітаі і інтэрвэнцыя імпэрыялістаў. Вайна Францыі ў Сірыі і г. д.

Афрыка. Войны ў Мароко.

Амэрыка. Злучаныя Штаты і Мэксіка. Злучаныя Штаты—Нікарагуа, Балівія—Парагвай і шэраг іншых.

Мы не гаворым ужо аб вялізарнай грамадзянскай вайне ў СССР і аб знадворнай вайне проці СССР, у якой прымала ўдзел, як вядома, ня менш 14 дзяржаў. Не гаворым ужо аб вайне белай Польшчы проці Саветаў у 1920 годзе і г. д.

Мы жывем у эпоху войн і рэвалюцый. У гісторыі ўжо ня раз было, што вайна паскарала рэвалюцыйнае разьвіцьцё, а рэвалюцыя ў сваю чаргу прыводзіла да новых войн. Ды самі войны ня раз зьмянялі, як кажуць, «на ходу» свой характар. Грунтоўнае становішча маркасысцкай дыялектыкі складаецца з таго, што ўсе межы ў прыродзе і грамадзкасьці ўмоўны і парушны, што няма **ніводнага** зьявішча, якое ня здолела-б пры вядомых умовах ператварыцца ў сваю процілеглась.

Калі мы, вучні Леніна, сьледам за ім гаворым, што мы жывем у эпоху войн і рэвалюцый—то гэта ні ў якім разе ня значыць, што рэвалюцыя можа нарадзіцца толькі з вайны. Рэвалюцыя можа выникнуць з вялікай сутычкі—гаварыў Ленін у 1916 годзе. Рэвалюцыя магла нарадзіцца з вялікай сутычкі гарнякоў, з усеагульнай забастоўкі ў гэткай краіне, як Англія, у 1926 г. Рэвалюцыя ў Англіі можа выникнуць з усеагульнай сутычкі, якая перарастае ў паўстаньне—у Індыі. Рэвалюцыя ў Аўстрыі магла выникнуць з Венскага паўстаньня. А хто асьмеліцца сказаць, што рэвалюцыя ў Нямеччыне немагчыма без вайны? Ці-ж з падзей падобнага тыпу, як маёўка 1929 году, у Бэрліне ня можа выникнуць рэвалюцыя? Хто асьмеліцца сказаць, што рэвалюцыя ў Італіі,—калі фашызм згніе,—немагчыма будзе без вайны? Хто скажа, што рэвалюцыя ў балканскіх дзяржавах немагчыма без вайны?

Але зьвесьці ленінскае вучэньне аб вайне і рэвалюцыі да таго, што рэвалюцыя немагчыма без вайны,—значыцца „обкорнать, окургузить" вучэньне Леніна, значыць сказіць яго ў апартуністычным духу.

З вучэньнем Маркса і Леніна аб вайне патрэбны адносіны асабліва асьцярожныя. Гэта неабходна таму, што мы жывём у эпоху войн і рэвалюцый, менавіта таму, што новая вайна, у якой зноў будзе вырашацца лёс савецкай улады і лёс сусьветнай рэвалюцыі наогул, бязумоўна, насоўваецца.

Гісторыя вучыць нас,—гаварыў Ленін,—што ніводнае буйнае пытаньне, ніводная рэволюцыя не нарадзілася інакш, як у шэрагу войн. Трэба быць гатовым да таго, што пры самай малой зьмене становішча імпэрыялістычныя драпежнікі зноў накінуцца на нас. Трэба быць гатовым да гэтага. Пытаньне іменна стаіць так: доўгі шэраг войн да гэтага часу выраніў ... лякай рэвалюцыі, усякай ... валюцыі. Такой вялізарнай ... зьяўляецца і наша рэвалюцыя.

У Леніна вайна ёсьць «одно из факторов», у ліку тых фактараў, ... прыводзяць да рэвалюцыі, ... носяць пры вядомых абставінах ... тварэньне рэвалюцыйнай сі... непасрэдную рэвалюцыю. ... ваць увагу пралетарыяту СССР ... летарыяту ўсяго сьвету на ... небасьпека новай вайны ... большай і большай—справа ... справа неабходная. Падмяц... тым, каб **„одно из слагаемых давать за всю сумму"**, ... няправільна тэарэтычна, ... прыводзіць да таго, што ... выя, апартуністычныя настр... камунізму і палітычна дапамо... ворагам міжнароднага ... кантр-рэвалюцыйнай сацыял-... ты.

Сацыялістычная рэвалюцыя ... выбухнуць **ня толькі** з-за ... і з-за буйнай сутычкі, або ... дэманстрацыі, або галоднага ... вайсковага